**УДК 811.161.1'36**

# ФУНКЦЫІ ГРАДУАТАРАЎ У СТРУКТУРЫ ТЭМПАРАЛЬНЫХ ПРЫНАЗОЎНІКАВЫХ СПАЛУЧЭННЯЎ РУСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***канд. філал. навук Г.Ч. РЫЖКОВІЧ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы)***
***annamichalouskaya@mail.ru***

*Разглядаецца лексікаграфічны статус градуатараў больш, болей, менш, меней (рус. больше, более, менее, меньше), прадстаўлены асноўныя функцыі градуатараў (прыназоўнікаўтваральная, канкрэтызуючая), прыводзіцца колькасць тэмпаральных прыназоўнікавых спалучэнняў з градуатарамі ў рускай і беларускай мовах. Даказваецца, што градуатары могуць як самастойна ўтвараць прыназоўнікавую парадыгму, так і ўскладняць парадыгмы прыназоўнікавых спалучэнняў з пэўнай семантыкай. Паказваецца, што градуатары ўяўляюць сабой поліфункцыянальны клас адзінак з шырокімі спалучальнымі магчымасцямі: яны могуць выступаць як у ролі базавага кампанента тэмпаральнага прыназоўнікавага спалучэння, так і ў ролі канкрэтызатара; градуатары спалучаюцца з квантытатывамі і могуць выступаць у якасці фармантаў не толькі тэмпаральных, але і сінтаксем з сінкрэтычным значэннем.*

***Ключавыя словы***: *тэмпаральнае прыназоўнікавае спалучэнне, базавы кампанент, канкрэтызатар, градуатар, парадыгма.*

**Уводзіны.** Даследаванні апошніх гадоў (працы М.У. Усеваладавай, М.І. Канюшкевіч, Е.Н. Вінаградавай і інш.) паказалі, што прыназоўнік мае палявую структуру з ядром, блізкай і далёкай перыферыйнымі зонамі. Ядро поля складаюць уласна прыназоўнікі, на перыферыі знаходзяцца адзінкі, не адзначаныя ў лексікаграфічных крыніцах і граматычных апісаннях як прыназоўнікі. Адна з груп – прыназоўнікавыя адзінкі (знамянальныя лексемы, якія адны або ў спалучэнні з першаснымі прыназоўнікамі ў тэксце выконваюць функцыю прыназоўніка, пры гэтым застаюцца ў межах сваёй часціны мовы; «цесныя адзінствы», якія «функцыянуюць у падпарадкавальным словазлучэнні як адзіны цэласны сродак сувязі яго кампанентаў» [1, с. 16]. М.І. Канюшкевіч выкарыстоўвае тэрмін «прыназоўнікавае спалучэнне» (далей – ПС), аналітычныя прыназоўнікавыя адзінкі, утвораныя на аснове спалучэння знамянальнай лексемы – базавага кампанента ПС – з адным ці некалькімі першаснымі прыназоўнікамі ў прэ- ці постпазіцыі) [2, с. 65].

Прыназоўнікавае спалучэнне можа быць ускладнена факультатыўнымі элементамі – канкрэтызатарамі. Аўтары «Русской грамматики» 1980 года ўжываюць тэрмін «канкрэтызатар (удакладняльнік)» у адносінах да ўдакладняючых значэнне злучнікаў слоў і адзначаюць, што «канкрэтызатар можа ўказваць на дабавачнасць далучаемага, на адпаведнасць або, наадварот, неадпаведнасць, несумяшчальнасць суадносных сітуацый» [3]. На думку П.П. Шубы, «канкрэтызатары ўдакладняюць тыя адносіны, якія выражаюцца прыназоўнікамі з багатым «спектрам» функцыянальных значэнняў» [1, с. 16]. У нашым даследаванні канкрэтызатары – гэта кампаненты, што канкрэтызуюць тыя ці іншыя параметры, якія ўводзяцца прыназоўнікавай адзінкай. У ролі і базавага кампанента, і канкрэтызатара ў структуру тэмпаральнага прыназоўнікавага спалучэння ўваходзіць градуатар.

Пад тэрмінам «градуіруемасць» Ю.Д. Апрэсян разумее «здольнасць некаторых уласцівасцяў падвяргацца колькаснай ацэнцы, якая ў лексем, што абазначаюць такія ўласцівасці, адлюстроўваецца ў здольнасці мець атрыбуты тыпу вельмі, крыху, ледзь-ледзь і да т.п. і ўтвараць ступені параўнання» [4, с. XXVI]. Як адзначае Ю.Л. Варатнікоў, семантычная катэгорыя градацыйнасці (градуальнасці – С.М. Калеснікава) ўключае ў сябе «розныя віды ступеняў, аб'яднаных інварыянтным значэннем меры прыкметы» [5, с. 70]. Б.Ю. Норман адзначае, што градацыйныя значэнні могуць быць выяўлены пры дапамозе спецыяльных слоў-градантаў, якія «мадыфікуюць ступень прыкметы, што называецца ў знамянальным слове, з якім яны спалучаюцца» [6, с. 21]. С.М. Калеснікава выкарыстоўвае тэрмін «градуатары». Градуатары – словы і спалучэнні слоў, «семантычная структура якіх змяшчае градасему (сему меры і ступені велічыні прыкметы)» [7, с. 48]. У нашым артыкуле градуатары – гэта знамянальныя лексемы *более / больше / менее / меньше* (бел. *болей / больш / меней / менш*).

Асноўная мэта артыкула – выявіць асноўныя функцыі градуатараў у структуры тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак.

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляюцца градуатары як структурныя кампаненты тэмпаральных прыназоўнікавых спалучэнняў, прадметам – функцыі градуатараў.

Матэрыялам даследавання паслужылі прыназоўнікавыя спалучэнні з тэмпаральнай семантыкай, выяўленыя ў граматычных апісаннях і слоўніках. Акрамя таго, некаторыя прыназоўнікавыя спалучэнні

былі атрыманы метадам мадэліравання па аналогіі з ужо існуючымі адзінкамі з наступнай верыфікацыяй іх кантэкстамі ў Нацыянальным корпусе рускай мовы і «Нацыянальным N-корпусе».

**Асноўная частка.** У сучасных слоўніках рускай мовы аўтары выдзяляюць два лексіка-семантычных варыянта слова *более:* прыслоўе і слова, якое ўдзельнічае ў фарміраванні аналітычнай формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў, прыслоўяў, слоў катэгорыі стану.

Так, у «Словаре русского языка» ў 4 тамах градуатары прадстаўлены як формы параўнальнай ступені прыметнікаў *вялікі / малы* і прыслоўяў *многа / мала*. Аўтары слоўніка фіксуюць асаблівасці ўжывання слоў *больше / более* ў адмоўным сказе ў значэнні «далее, вперед». У «Толковом словаре русского языка» пад рэдакцыяй Д.Н. Ушакова адзначаецца функцыяніраванне слоў *более/больше, менее/меньше* ў якасці параўнальнай ступені да прыметнікаў *большой / маленький* і прыслоўяў *много /мало*. У «Новом толково-словообразовательном словаре» Т. Яфрэмавай адзначаецца функцыяніраванне градуатараў *больше / более* як прыслоўяў і прэдыкатываў. Як прыслоўе градуатары маюць значэнне «преимущественно, главным образом». У адмоўных канструкцыях *больше / более* маюць значэнне «далее, впредь», таксама дадзеныя градуатары могуць ужывацца пры ўказанні на перавышэнне абазначанай колькасці (у спалучэннях з колькаснымі назоўнікамі або колькасна-іменнымі спалучэннямі).

Прыслоўе *более* лексікаграфічныя крыніцы рускай мовы трактуюць як сінонім прыслоўя *больше* ў некалькіх значэннях: як вышэйшую ступень параўнання ад *много* і *большой*, як прыслоўе, якое спалучаецца з колькаснымі назоўнікамі або колькасна-іменнымі спалучэннямі і служыць для абазначэння перавышэння колькасці. У Рускай граматыцы 1980 г. *болей* характарызуецца як часціца, цесна звязаная з кампаратывам, у ёй адбываецца сумяшчэнне значэння акцэнтавання з якасна-характарызуючым значэннем.

Такім чынам, у лексікаграфічных крыніцах словы *более/больше*, *менее/меньше* разглядаюцца як 1) прыслоўі, 2) прэдыкатывы, 3) форма параўнальнай ступені ад прыметнікаў і прыслоўяў. Іх асноўнае значэнне – указанне на перавышэнне або памяншэнне абазначанай колькасці.

Па значэнні словы *болей / больш* блізкія, аднак маюць розную стылістычную акраску, што адзначаецца некаторымі слоўнікамі, напр., прыслоўе *болей* мае памету кніжн., устар., слова *больш* часцей ужываецца ў гутарковай мове. Слова *более* ў цэласным словазлучэнні мае лексічныя абмежаванні і патрабуе канкрэтызацыі, выражанай колькасным значэннем, у адрозненне ад *больш*, якое не мае ў складзе колькасна-іменнага спалучэння валентнасных абмежаванняў.

Таксама трэба адзначыць сінтаксічныя і лексічныя валентнасныя асаблівасці слоў *болей / больш*, *меней / менш*, якія кіруюць назоўнікам або спалучэннем назоўніка з лічэбнікам з семантыкай часу, патрабуючы ад яго формы роднага склону, утвараюць з ім адну сінтаксему, выражаюць значэнне колькасці.

Градуатары – поліфунцыянальныя адзінкі. Адна з функцый градуатараў – *прыназоўнікаўтваральная*. Градуатары – самая прадуктыўная група для ўтварэння прыназоўнікавых спалучэнняў. Гэта абумоўлена, з аднаго боку, іх семантыкай (градуатары ў спалучэнні з колькаснымі імёнамі абазначаюць адпаведна памяншэнне і павелічэнне колькасці), з другога – шырокімі спалучальнымі магчымасцямі, так як, акрамя тэмпаральных, градуатары ўваходзяць у склад фармантаў прасторавых сінтаксем (***не болей чым на*** *5 кіламетраў*), квантытатыўных (***не болей*** *трох лодак*), квантытатыўна-дыстрыбутыўных (***не болей чым на*** *1,8 працэнта ў месяц*) і інш. [13]. Колькасць тэмпаральных прыназоўнікавых спалучэнняў з градуатарамі прадстаўлена ў табліцы 1.

Табліца 1. – Колькасць тэмпаральных прыназоўнікавых спалучэнняў з градуатарамі ў рускай і беларускай мове

| Градуатар (руская мова) | Колькасць ПС | Градуатар (беларуская мова) | Колькасць ПС |
|---|---|---|---|
| Более | 85 | больш | 118 |
| менее | 77 | менш | 89 |
| Больше | 71 | меней | 86 |
| Меньше | 66 | болей | 81 |

Градуатары могуць выступаць у ролі ўласна прыназоўніка: ***Больше года*** *никому не звонил* (А. Битов) [Інт.]. *Боевые действия на территории Дагестана продолжались* ***более месяца*** (Г. Садулаев) [Інт.]. *По предварительным оценкам, на устранение неисправности потребуется* ***не менее недели*** (С. Лесков) [Інт.]. *Роман с этой женщиной продолжался* ***не меньше двух лет*** (А. Сапегина) [Інт.]; бел. ***Больш за тыдзень*** *родныя, сябры і паплечнікі шукалі Дашкевіча, якога 30 кастрычніка выязны мазырскі суд вырашыў накіраваць з калоніі ў адну з трох «крытых» турмаў* [Інт.]. ***Больш як год*** *у Беларусі прадметна гавораць пра важнасць супольнай працы дзяржавы і грамадства ў захаванні нашых гістарычных помнікаў* (І. Тулупава) [Інт.].

Як прыназоўнікам, градуатарам уласцівы свой тып парадыгмы. Градуатары фарміруюць некалькі парадыгм: морфасінтаксічную (у спалучэнні з кампаратарамі і абмежавальнікам): рус. *более / больше; более чем / больше чем; не более / не больше; не более чем / больше чем; менее / меньше; менее чем / меньше чем; не менее / не меньше; не менее чем / меньше чем;* бел. *болей / больш; болей за / больш за;*

*болей чым / больш чым; болей як/ больш як; не болей / не больш; не болей за / не больш за; не болей чым / не больш чым; меней / менш; меней за / менш за; меней чым / менш чым; меней як/ менш як; не меней / не менш; не меней за/ не менш за; не меней як / не менш як.*

Парадыгма можа пашырацца за кошт уключэння ў яе склад:

а) першасных прыназоўнікаў: рус. *более … **от**, более чем **на**, более чем **через**, не менее чем **на**, не менее чем **до***; бел. *болей чым **на**, больш чым **праз**, меней чым **праз**, не менш чым **на**, не меней як **на***;

б) другасных прыназоўнікаў: рус. *более … **назад**, больше … **тому назад**, менее чем … **назад**, менее … **тому***; бел. *больш за … **таму**, больш за … **таму назад**, больш як … **назад**, больш як … **таму назад**.*

У структуры тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак градуатары таксама могуць выступаць у ролі канкрэтызатара.

Градуатары ўваходзяць у склад мнагакампанентных прыназоўнікавых адзінак – фармантаў, базавым кампанентам якіх з'яўляюцца назоўнікі *период*, *интервал*, *промежуток* (бел. *перыяд*, *інтэрвал*, *прамежак*), у іх семантыцы ёсць указанне на абмежаванне працягласці працэсу або падзеі: рус. ***с периодом меньше** месяца*, ***с интервалом более** года*; бел. ***з перыядам менш** дзесяці дзён*, ***з інтэрвалам менш** месяца*. Як правіла, дзеянне абмежавана ніжняй і верхняй межамі.

Напрыклад, *за перыяд болей за; за перыяд болей чым; за перыяд болей як; за перыяд больш; за перыяд больш чым; за перыяд больш як; за перыяд не болей за; за перыяд не болей чым; за перыяд не болей як; за перыяд не больш за; за перыяд не больш чым; за перыяд не больш як; за перыяд меней за; за перыяд меней чым; за перыяд меней як; за перыяд менш за; за перыяд менш чым; за перыяд менш як; за перыяд не болей за; за перыяд не болей чым; за перыяд не болей як.*

Колькасць прыназоўнікавых спалучэнняў у такой расшыранай морфасінтагматычнай парадыгме павялічылася за кошт градуатараў *больш*, *болей*, *менш*, *меней* (*з перыядам **менш** дзесяці дзён*, *з перыядам **менш** тыдня*) у спалучэнні з кампаратарамі (*з перыядам **менш чым** дзесяць дзён*, *на перыяд **больш як** тыдзень*) і абмежавальнікам *не* (*на перыяд **не больш чым** тыдзень*).

Ускладненне прыназоўнікавага спалучэння адбываецца наступным чынам:

− прыназоўнікавае спалучэнне + градуатар (*з перыядам больш* колькіх адзінак часу, *з перыядам менш* колькіх адзінак часу);

− прыназоўнікавае спалучэнне + градуатар + кампаратар (*з перыядам больш чым* колькі адзінак часу, *з перыядам больш як* колькі адзінак часу);

− прыназоўнікавае спалучэнне + абмежавальнік + градуатар + кампаратар (*з перыядам не больш чым* колькі адзінак часу, *з перыядам не больш як* колькі адзінак часу).

Градуатары таксама выконваюць функцыю апраксіматара – паказчыка прыблізнасці часу. У кантэкстах: рус. *Из-за тяжёлого материального положения семьи посещал школу **не более года**, но сумел выучиться грамоте и полюбил книги* [Інт.]. *Ремонт подлодки «Екатеринбург» займет **не менее года*** [Інт.]. *Одни пролежали там **не меньше десяти лет**, другие – несколько недель* (Е. Бай) [Інт.]; бел. *Але **больш чым на тыдзень** майго імпэту чамусьці не хапала* [Інт.]. ***Больш за тыдзень** гомельскія донары не маглі атрымаць грошы за здадзеную кроў* [Інт.]. ***Больш як трыццаць гадоў** я кожны тыдзень прыязджала ў Руан, каб яе пабачыць* [Інт.]. *Для таго, каб рыба набрала паўтара кілаграма вагі, патрабуецца **не менш за сем месяцаў*** [Інт.].

Выбар градуатара абумоўлены задачай гаворачага: калі яму неабходна адкрыць верхнюю мяжу, то выкарыстоўваюцца градуатары рус. *больше / более*, бел. *больш / болей* (рус. ***более** года*, ***больше** двух недель*; бел. ***больш** пяці гадоў*, ***больш** чым два разы на год*, ***болей** чым на месяц*), калі ніжнюю – то перавага аддаецца градуатарам рус. *менее / меньше*, бел. *менш / меней* (рус. ***менее** недели*, ***меньше** трех месяцев*; бел. ***менш** месяца*, ***менш** чым на год*).

Градуатары могуць уваходзіць як у склад фарманта, так і ў склад лексічнага кампанента тэмпаральнай сінтаксемы: параўн.: рус. ***больше чем на** месяц – **на больше чем** месяц*; бел. ***болей чым на** месяц – на **болей чым месяц**, **больш за** год – **за больш чым / як** год.*

**Заключэнне**. Градуатары – асобы клас адзінак, якія мадыфікуюць ступень прыкметы, што называецца ў знамянальным слове, з якім яны спалучаюцца.

Для градутараў характэрны шырокія спалучальныя магчымасці, паколькі яны спалучаюцца з квантытатывамі і могуць выступаць у якасці фармантаў не толькі тэмпаральных, але і сінтаксем з сінкрэтычным значэннем.

Градуатары поліфункцыянальныя: яны з'яўляюцца базавым кампанентам для ўтварэння тэмпаральных прыназоўнікавых адзінак, служаць для расшырэння прыназоўнікавай парадыгмы і выконваюць функцыю апраксіматара.

Градуатары ўтвараюць сваю парадыгму: морфасінтаксічную (рус. *более – не более – более – не более чем на*; бел. *болей – болей чым – болей за – болей як – не болей – не болей* чым і інш.), формаўтваральную (рус. *более – больше*, *менее – меньше*; бел. *болей – больш*, *меней – менш*).

ЛІТАРАТУРА


1. Шуба, П. П. Прыназоўнік у беларускай мове / П. П. Шуба. – Мінск : БДУ імя У. Леніна, 1971. – 224 с.
2. Конюшкевич, М. И. Релятивный потенциал имени / М. И. Конюшкевич // Лінгвістичні студії: зб. наук. праць / Донецький нац. ун-т ; наук. ред. А. Загнітко. – Донецьк, 2008. – Вип. 16. – С. 60–66.
3. Русская грамматика : в 2 т. / под ред. Н.Ю. Шведовой. – М. : Наука, 1980. – Т. 1. – 783 с.; Т. 2. Синтаксис. – 714 с.
4. Апресян, Ю. Д. Лингвистическая терминология словаря / Ю. Д. Апресян // Новый объяснительный словарь синонимов русского языка; под общ. рук. Ю. Д. Апресяна. – М.; Вена : Языки славянской культуры; Венский славистический альманах, 2004. – С. XXII–LII.
5. Воротников, Ю. Л. Функционально-грамматическая сфера градационности признака в современном русском языке : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.02 / Ю. Л. Воротников ; Ин-т РАН. – М., 1987. – 26 с.
6. Колесникова, С. М. Функционально-семантическая категория градуальности в современном русском языке / С. М. Колесникова. – М. : Высш. шк., 2010. – 279 с.
7. Норман, Б. Ю. К вопросу о внутренней структуре функционально-семантического поля / Б. Ю. Норман // Исследования по языкознанию: К 70-летию члена-корреспондента РАН Александра Владимировича Бондарко / отв. ред. И. В. Недялков. – СПб. : СПбГУ, 2001. – С. 13–22.
8. Канюшкевіч, М. І. Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання : матэрыялы да слоўніка : у 3 ч. / М. І. Канюшкевіч. – Гродна : ГрДУ, 2008–2011. – 3 ч.


*Пастуліла 30.11.2018*

## THE FUNCTIONS OF GRADUATION IN THE STRUCTURE OF TEMPORAL PREPOSITIONAL COMBINATIONS OF RUSSIAN AND BELARUSIAN LANGUAGES

***H. RYZHKOVICH***

*We consider lexography status graduate more pain, me, me (Rus. more, more, less, fewer), presents the main functions of cities (prenatal, contratista), gives the amount of thermal Priazovskaya combinations with gradutaion in Russian and Belarusian languages. It is proved that graduatory able independently to form prikaznov paradigm and paradigm clarnece prenatal combinations with a certain semantics. The main changes maraline privatae combination, a base component, concretizacao, graduate, apraxia, paradigm. The purpose of the study is to identify the basic functions graduate in the structure temporally prenatal units. Scientific news of the conducted study lies in the fact that graduatory represent papuntang class units: they can act both as base componenta foreign Priazovskaya combinations, and as concretizacao, graduatory healthy to form independently Prinsendam paradigm and complicate the paradigm printou combinations.*

***Keywords**: the proposed temporal combination, a base component, concretization, graduator, approximator paradigm.*